Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛІСТАПАДА 2015 г. АЎТОРАК № 217 (28075) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Пенсіянеры супраць ашуканцаў

СТАР. 5

У якой валюце прымнажаць зберажэнні

СТАР. 6

Вялікае Княства. Уласны погляд

СТАР. 8

УСМЕШКА ПОЗНЯЙ ВОСЕНІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім ЕРМАЛОВІЧ, першы намеснік міністра фінансаў:

«Трэба разумець, што дэнамінацыя не павінна і не будзе прыводзіць да якога-небудзь росту цэн. Гэта самае важнае. Дэнамінацыя не ўяўляе сабой абясцэньвання нацыянальнай валюты, яна ўяўляе сабой іншыя адзінкі вымярэння. Пакупніцкая здольнасць тых сродкаў, якія захоўваюцца на рахунках грамадзян, не зменіцца. Ніякіх рызык для людзей, якія захоўваюць свае сродкі ў беларускіх рублях, няма. Пытанне ў спрашчэнні саміх аб'ёмаў руху сродкаў па рахунках, у скарачэнні нулёў. Правядзенне дэнамінацыі — паказчык таго, што і ўрад, і Нацыянальны банк гатовыя рэалізоўваць узважаную эканамічную палітыку, якая не будзе прыводзіць да высокай інфляцыі, якая будзе паказваць стабільнасць нацыянальнай валюты».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.11.2015 г.

Долар ЗША	17641,00	▲
Еўра	18 981,00	▼
Рас. руб.	272,58	▼
Укр. грыўня	776,28	▲

ISSN 1990 - 763X

MINSK international film festival LISTAPAD

ВЯЛІКАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ АДКРЫЦЦЯ

На фестывалі ўсё толькі пачынаецца

Памятаеце карціну італьянскага рэжысёра Паола Сарэнціна «Вялікая прыгажосць»? Галоўны герой, расчараваны 65-гадовы пісьменнік і журналіст Джэп Гамбардэла, што назірае за крызісам грамадства ў невымоўна прыгожым Рыме, сустракае ў вечаровым горадзе жанчыну-легенду, жанчыну-багіню, жанчыну-мару, вялікую, сугучна назве фільма, актрысу. Саму сябе ў гэтым эпізодзе сыграла француженка Фані Ардан. Гэтая выпадковая сустрэча — быццам прывід — мае такое ж моцнае, магічнае ўздзеянне на героя сваёй прыгажосцю, як і сам Рым. Гамбардэла толькі застывае ў непрыкрытым любаванні. Вялікая прыгажосць, актрыса і рэжысёрка Фані Ардан выйшла на сцэну сталічнага Палаца Рэспублікі як госця XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Бяспройгрышнае рашэнне для цырымоніі адкрыцця.

«Я ніколі не любіла турызм, але я заўсёды любіла кіно, дзякуючы якому змагла падарожнічаць, сустракаць людзей і знаёміцца з імі. Быць запрошанай сюды, прысутнічаць на адкрыцці «Лістапада» і некалькі дзён правесці ў гушчы падзей у вашым горадзе — для мяне вялікая радасць», — вымавіла Ардан са сцэны нізкім глыбокім голасам.

Кінематограф сёлета адзначае сваё 120-годдзе, таму цырымонія адкрыцця «Лістапада» прайшла ў атмасферы «залатога века» кіно: у фае чуліся сусветныя джазавыя хіты, на экране госці фестывалю маглі бачыць і фільм піянераў кінематографа братоў Люм'ер, і карціну Чарльза Чапліна, і першую гукавую стужку «Спявак джазу». Тут жа перад пачаткам урачыстасці адбылося дэфіле

Фота БЕЛТА.

мадэляў, што прадэманстравалі калекцыю вечаровых сукенак ад беларускага дызайнера Мікалая (ці Нікаля) Марозава.

Мерапрыемства не абышлося без сваіх традыцыйных эпізодаў: важкі і габарытны спецыяльны прыз Прэзідэнта «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» атрымаў расійскі рэжысёр Вадзім Абдрашытаў *(на фота)*, які сёлета з'яўляецца старшынёй міжнароднага журы асноўнага конкурсу іграваога кіно. Для яго гэта было нечаканасцю, як і для гасцей: «У мяне шмат звязана, і добра звязана, з Мінскам. Я здымаў тут карціну «Плюмбум, ці Небяспечная гульня», асобныя эпізоды «Слугі». Мы жылі ў Мінску, і пра гэта жыццё засталіся добрыя ўспаміны, за што шчыры дзякуй і гораду, і тым людзям, якія мне тады дапамагалі. У вельмі даўнія часы я праходзіў ваенныя зборы ў Старых Дарогах, калі хто ведае. (Зала адгукнулася веданнем і апладысментамі.)

СТАР. 4